Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: ***www.baza-belarus.org, e-krama.com***
Электронны адрас: ***viestki@mail.com***
✉: ***VIESTKI, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735***

№ 8 (558)
Жнівень 2012 г.

Беларускае Купальле ў штаце Нью-Ёрк

За гады ваяўнічага атэізму і бязбожнага сацыялізму мы, беларусы, шмат што страцілі з нашых звычаяў і абрадаў. Забыцьцё сваіх традыцыяў і культуры адмоўна ўплывае на выхаваньне асобы і грамадзтва. Культура беларусаў базуецца на фальклёры – адным з самых багатых у Эўропе. І гэта тое, што мы мусім шанаваць, бо страчваючы яго, мы перастаём быць нацыяй – беларусамі, зьнікаем як народ.

Часта мяне папракаюць, маўляў, якая ж я хрысьціянка, калі ладжу нашыя традыцыйныя Гуканьні вясны, Купальлі, Каляды. Таму сёньня я хачу выказаць свой погляд на гэта. Любоў і ўдзячнасьць – фундамэнтальныя пачаткі прыроды. У прыродзе ўсё гарманічна. Энэргія слова, малітвы і песьні можа аказваць уплыў на сусьвет. Словы, зьляцеўшыя з нашых вуснаў, валодаюць сваёю ўласнаю сілаю, якая ўплывае на ўвесь сьвет. Словы, што распавядаюць нам аб прыродзе, – гэта словы самога Творцы. Малітвамі і добрымі песьнямі можна ачысьціць ваду як у посудзе, так і ў возеры, супакоіць нэрвы, прыдбаць аптымістычны настрой. Чым больш людзей бярэ ўдзел у малітве ці песнапеньні, тым відавочней будзе вынік.

Заканчэньне на бачыне 10

Здымак С. Трыгубовіча.



Марш Тыдня Паняволеных Народаў

У нядзелю, 15 ліпеня 2012 году, на Мангэтане прайшоў Марш Паняволеных Народаў, што праводзіцца штогод у рамках Тыдню Паняволеных Народаў, што быў усталяваны ў 1959 годзе адмысловым урадавым законам, даў пляцоўку для выказваньня нязгоды эміграцыйных арганізацыяў народаў, што былі паняволеныя расейскім камунізмам. Пад кіраўніцтвам Камітэту Паняволеных Народаў, на працягу дзясяткаў гадоў, на кожны трэці тыдзень ліпеня Нью-Ёрк рабіўся трыбунаю масавых дэманстрацыяў і публічных акцыяў

Заканчэньне на бачыне 12

Здымак Н. Патапенка



Ліпеньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу, 14 ліпеня, у Доме Маракоў на Мангэтане адбыўся чарговы ліпеньскі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня Віталь Зайка распавёў коратка пра апошнія падзеі ў Беларусі. Працягваецца перасьлед апазыцыі й іншадумства. Рэпрэсіі, міліцэйская сваволя, прадказальныя суды – усе гэтыя рэчы, на якія колішнія паняволеныя народы Ўсходняй Эўропы пасьля 1989 году ўжо забыліся, пышна квітнеюць у Беларусі 21- га стагодзьдзя. Пры гэтым дыктатар Беларусі ўжо 18 гадоў выстаўляе ў цэнтры Эўропы сярэдні, умоўна кажучы, палец гэтай самай Эўропе ды ўсяму цывілізаванаму сьвету, а яны робяць выгляд, што нічога не заўважаюць. Чамусьці ім былі шмат цікавейшыя і вартыя ўмяшаньня падзеі на іншых кантынэнтах – у Лібіі, у Паўднёвым Судане й Усходнім Тыморы. ААН не склікае надзвычайных сэсіяў, прэзыдэнт ЗША не вырашае з дарадцамі, што рабіць з Лукашэнкам. Затое трэба адзначыць дзіўную зьяву, калі псэўдалібэралы, з крывянячымі сэрцамі за ўсіх прыгнечаных і нядольных, чамусьці прыяжджаюць ладзіць дэманстрацыі й пратэсты ня ў Менск, ня ў цэнтар Эўропы – а ў экзатычны Ерусалім, сталіцу адзінай дэмакратыі на Блізкім Усходзе. Справа абароны правоў палестынцаў весьці тэрарыстычную партызантку супраць ізраільцаў падаецца ім больш слушнай і надзённай, чым аднаўленьне дэмакратыі ў эўрапейскай краіне, паняволенай посткамуністычнай дыктатурай. Ці можа прычына ў тым, што тыя псэўдалібэралы пэўныя сваёй бясьпекі ў Ерусаліме, але ўважаюць, што кантакт з слугамі рэжыму ў Менску можа быць шкодны для здароўя? Так ці гэтак, “паўналецьце” рэжыму Лукашэнкі аказалася несапсутае міжнароднымі анархістамі, трацкістамі ды акупайцамі Ўол-стрыту, што звычайна даюць жару на імпрэзах кіраўнікоў вольнага сьвету, але не паказваюць носу ў Зімбабвэ, Аўганістан, Паўночную Карэю ці ў Беларусь.

Затым сп. Зайка распавёў пра маючую адбыцца назаўтра пасьля сходу імпрэзу – Марш Паняволеных Народаў, у якой традыцыйна бяруць удзел прадстаўнікі беларускай грамады, пачынаючы з канца 1950-х гадоў. Прамоўца коратка спыніўся на гісторыі стварэньня Камітэту Паняволеных Народаў і правядзеньня ім Тыдняў Паняволеных Народаў, заклікаў усіх прысутных далучыцца заўтра да Маршу.

Сп-ня Валянціна Якімовіч распавяла пра пасьпяхова праведзенае ў канцы чэрвеня традыцыйнае сьвята Купальля ў штаце Нью-Ёрк, якое сабрала рэкордную колькасьць удзельнікаў, што актыўна танчылі, сьпявалі традыцыйныя песьні, вадзілі карагоды, скакалі праз вогнішча.



Здымак В. Дударава.

Затым прысутныя прывіталі патрыярха беларускай грамады ў Амэрыцы, выдатнага грамадзкага і культурніцкага дзеяча, сузаснавальніка шэрагу беларускіх нацыянальных арганізацыяў і проста шчырага і адданага змагара за Беларусь сп. Антона Шукелойця, якому ў ліпені месяцы спаўняецца 97 год. Юбіляра ад імя Згуртаваньня “Пагоня” павіншаваў ягоны старшыня Віталь Зайка. Ён коратка нагадаў асноўныя этапы жыцьцёвага шляху сп. Антона Шукелойця, які адлічвае свой удзел у беларускай нацыянальнай справе з 1931-га году. Сп. В. Зайка адзначыў тую дапамогу і падтрымку, якую сп. А. Шукелойць аказаў прадстаўнікам новай хвалі эміграцыі зь Беларусі ў ЗША ў канцы 1990-х і ў 2000-я гады. З прывітаньнямі выступілі таксама сакратар аддзелу Валянціна Якімовіч і архіяпіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Народнай Царквы Юры (Рыжы).

З словам у адказ выступіў сп. Антон Шукелойць. Ён падзякаваў за віншаваньні й сказаў, што ўважае сябе дасюль адданым беларускай справе, і спыніўся на некаторых падзеях з свайго жыцьця, на асобах, зь якімі давялося разам працаваць і змагацца. Прамоўца адзначыў, што падчас нямецкай акупацыі Беларусі людзі, якіх цяпер прынята бэсьціць і называць нямецкімі халуямі, рабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб праз свае беларускія арганізацыі ратаваць беларусаў ад сьмерці, хоць крыху палегчыць цяжар навалы й выпрабаваньняў ваеннга часу. Удавалася нават дапамагаць землякам-гэбраям, выцягваць іх з гета. Пасьля ў Нямеччыне і ў Амэрыцы гэтая ваенная хваля эміграцыі стала хрыбтом сьвядомага нацыянальнага беларускага жыцьця на чужыне, занялася адукацыйнай і культурніцкай працай сярод беларусаў, што мусілі выехаць з Бацькаўшчыны, але ніколі не забыліся на яе. Сп. Шукелойць выказаў аптымізм у справе адраджэньня беларускай мовы і сапраўднай свабоды ў Беларусі.

Словы юбіляра былі выслуханыя з увагай і цікавасьцю. Шмат для каго сп. Шукелойць – жывая гісторыя беларускага змаганьня, доказ таго, што жыла Беларусь і жыць будзе, хоць бы і за тысячы міляў ад родных мясьцінаў. Затым сп-ня В. Якімовіч запяяла юбіляру палескую песьню “За гарамі, за даламі галубы ляцелі”.

Потым прысутныя мелі нагоду выпіць за здароўе сп. А. Шукелойця, пагутарыць зь ім, а таксама пакалегавацца з суайчыньнікамі за прысмакамі, забясьпечанымі з нагоды сьвяткаваньня дня народзінаў сп. Шукелойця.

Віталь ЗАЙКА

Разгортваецца кітайскае нашэсьце на Беларусь

Альбо мы спынім лукашыстоўска-кітайскі кашмар, альбо нас чакае няволя і нацыянальная трагедыя.

Зласкі антыбеларускага рэжыму дзясяткі тысячаў кітайскага насельніцтва ўжо атабарыліся на нашай зямлі. Рэжым плянуе назаўсёды атабарыць у Беларусі сотні тысячаў чужынцаў – больш за мільён. Сусьветная практыка паказвае, што калі на нейкай некітайскай тэрыторыі гэтай расы становіцца сотні тысячаў і больш за мільён, то пішы прыпала – гэтая тэрыторыя становіцца кітайскай. Мясцовы народ або раствараецца ў жоўтым моры, або ўцякае з родных мясьцінаў. Як вядома, нам, беларусам, уцякаць няма куды, у нас няма нейкай іншай зямлі, акрамя той, якую нам даў у валадараньне Бог.

Гэта ня ёсьць нашае тэарэтычнае разважаньне або практыкаваньне ў футуралёгіі. Кітайскае нашэсьце ўжо разгортваецца па Беларусі. Пакуль у некалькіх яе зонах, якія можна цьвяроза вызначыць як кітайскія пляцдармы, зь якіх пачнецца шырокамаштабны кітайскі захоп нашай краіны і пагроза ўсёй Эўропе. Калі іх стане паабяцаны Лукашэнкам мільён, то кітайцаў ня спыніш, яны ўжо ня будуць прытрымлівацца ніякіх лукашыстоўскіх плянаў. Яны папруць на Беларусь, вытаптваючы ўсё на сваім шляху. Таму што яны (разам з "кітаістам" Лукашэнкам і ягонай хунтай) упэўненыя, што беларусы ня будуць супраціўляцца і бараніць сваю зямлю.

З розных месцаў Беларусі апошнім часам паступаюць па-сапраўднаму драматычныя зьвесткі (пакуль што яны не афарбаваныя крывёй, але гэта часова). Напрыклад, у Новалукомлі кітайцаў ужо столькі, што ў горадзе пачынаюць зьяўляцца вывескі і публічныя інфармацыі, напісаныя іерагліфікай. У мясцовай паліклініцы пад расейскімі шыльдамі вісяць кітайскія іерагліфічныя (гэта бачна на фатаздымку). Атрымалася якраз тое, ад чаго засьцерагаў беларусаў Народны Фронт: калі каму ня хочацца размаўляць і пісаць на беларускай мове (маўляў, "а зачем?"), то прыйдзецца тэрмінова вучыцца кітайскай мове. Мясцовыя жыхары сутыкнуліся з кітайскай навалай ня толькі ў паліклініцы і на вуліцах. Рассыпалася ў нішто бюргерская ўпэўненасьць у тым, што, маўляў, нягледзячы ні на што, мы камфортна адседзімся на сваіх дачах, за высокім плотам на сваім гародзе. А што кітайцам дачны плот? Іх і Вялікі Кітайскі Мур не спыніў.



Адбываецца наступнае. На вялікія дачныя паселішчы набягаюць "малыя кітайскія групы" па 50-100 чалавек. Яны без комплексаў і, не вітаючыся з гаспадарамі, заходзяць на дачны ўчастак і апэратыўна запаўняюць яго сабой. Дзейнічаюць, як саранча. Абрываюць ягады, выцягваюць з градак моркву і цыбулю, трасуць пладовыя дрэвы. Праз кароткі час у садзе-гародзе застаюцца толькі "рожкі ды ножкі". Гаспадары-беларусы лемантуюць, тэлефануюць у міліцыю. Прыязджае патруль, спрабуе затрымаць "малую групу". Але канфіскаваць у саранчы ўжо няма што. Яна ўжо прагна праглынула ўсё, што абарвала ў садзе-гародзе – ня мыючы і бяз солі.

Пакуль міліцыя разьбіраецца з гэтай групай, на іншым канцы дачнай зоны эфэкт саранчы арганізоўваюць яшчэ некалькі "малых групаў". Змагацца з гэтым немагчыма, міліцыі ўжо катастрафічна не хапае. Калі пачытаць пра такое ў гістарычных кніжках, то наступным народным крокам у такой сытуацыі становіцца стварэньне народных атрадаў самаабароны, якія бароняць сваю лякальную тэрыторыю і свае лякальныя багацьці. А ў агульнадзяржаўным маштабе народ арганізоўвае ліквідацыю рэжыму, які спрыяе чужынскаму нашэсьцю. Лёс ставіць перад мільёнамі нашых людзей пытаньне рубам: альбо мы спынем лукашыстоўска-кітайскі кашмар, альбо нас чакае няволя і нацыянальная трагедыя.

Юрка МАРОЗАЎ

Сцэны з жыцьця пры позьнім лукашызме

У Вене 12 ліпеня адбываўся нештодзённы спэктакаль паводле даўно знаёмага псэўдадэмакратычнага сцэнару. У сталіцу Аўстрыі і АБСЭ прыбыла арцыфальсыфікатарка Л. Ярмошына, старшыня лукашыстоўскай ЦВК. Яе запрасіла АБСЭ на сваю канфэрэнцыю пад тытулам "Дэмакратычныя выбары і назіраньне за імі". Шум вакол гэтай асобы быў узмоцнены яшчэ адным актам. Антыбеларускі рэжым спыніў у менскім аэрапорце В. Карняенку, які зьбіраўся ляцець у Вену на тую ж канфэрэнцыю ад мясцовай псэўдаапазыцыі.



Дэмакратычныя заходнія прадстаўнікі загулі: "Мы пратэстуем! Дайце нам Карняенку!" Вядома, аднак, што і Лукашэнка, і Ярмошына, і Карняенка заадно – усе яны за масавы ўдзел публікі ў лукашыстоўскім фальшывым фарсе пад назовам "выбары". Таму іх, дарэчы, і прымаюць у Вене. Бачна, што АБСЭ зацікаўлена ў захаваньні дыктатуры Лукашэнкі (гэта адпавядае інтарэсам Бэрліна, які дамінуе ў эўраструктурах).

У "бой" супраць Ярмошынай (але ня супраць псэўдавыбараў) у Вене пайшла толькі адна асоба. Гэта была невядомая раней мастачка М. Напрушкіна. Перад ганкам сядзібы АБСЭ яна расклала на асфальце некалькі аркушоў ватману з заклікамі і партрэтамі Ярмошынай і іншых. На ватмане ўзурпатар Лукашэнка на поўным сур'ёзе называецца прэзыдэнтам Беларусі, няма аніслова пра неабходнасьць байкатаваць фальшывыя "выбары". Зразумела, што Напрушкіна не дадумалася выйсьці на сваю акцыю пад нацыянальным Бел-Чырвона-Белым Сьцягам ("а зачем?"). Адным словам, звычайны моб-шмоб псэўдаў і звычайны маразм эўраструктураў.

* * *



З постсавецкай Малдовы надышлі цікавыя зьвесткі. 12 ліпеня парлямэнт краіны прыняў Закон аб забароне камуністычнай, савецкай і фашыстоўскай сымболікі. Цяпер савецкія сьцяг, герб і іншае з бальшавіцкага забаронена публічна выкарыстоўваць у краіне, якая моцна пацярпела ў пэрыяд камуна-маскоўскай акупацыі. Камуністычная меншасьць у парлямэнце начале з генсекам кампартыі Вароніным дэманстрацыйна пакінула залю паседжаньняў і ў галасаваньні ня ўдзельнічала. Усё вырашылася безь іх.

Яшчэ нядаўна кіруемая Масквой "банда Вароніна" неабмежавана валадарыла ў Малдове. Гэты Воронін быў прэзыдэнтам Малдовы. Яны давялі краіну да глыбокага эканамічнага крызісу. Амаль усё працаздольнае насельніцтва вымушана было шукаць працы за межамі краіны, перш за ўсё ў Заходняй Эўропе. Вырасла цэлае пакаленьне малдаван, якія выхоўваліся ў дзядуль-бабуль і амаль ня бачылі сваіх бацькоў-гастарбайтэраў, што гадамі працавалі на Захадзе. У сакавіку 2009 году дзясяткі тысячаў юнакоў атакавалі і разграмілі сядзібу кіруючай кампартыі, сядзібу прэзыдэнта Вароніна і пагналі з парлямэнту камуністычную большасьць. Рэжым кінуў на моладзь спэцчасткі, якія здушылі народны выступ, катавалі і забівалі маладых. Бальшавіцкае начальства выступала па тэлебачаньню з адкрытымі пагрозамі расправіцца з усімі, хто выступіць супраць камуны. Але малдаване не напалохаліся, пачаўся ўсенародны супраціў хунце. Ужо праз паўгода камуністы сталі меншасьцю ў парлямэнце, Воронін згубіў прэзыдэнцтва, а камандзёраў і выканаўцаў злачынных загадаў пацягнулі ў суд (многія зь іх уцяклі ў Расею). І вось зроблены чарговы важны крок па ліквідацыі камуністычнай гідры. Раней такі закон быў прыняты парлямэнтам Летувы. Пасьля ліквідацыі лукашызму аналягічны Закон будзе прыняты дэмакратычным парлямэнтам вызваленай Беларусі.

* * *

Працягваюць свае дурныя гульні на сур'ёзныя тэмы "псэўды". У "незалежнай дэмжурналістыкі" зьявілася новая тэма і новы герой. Нейкі, непазначаны імем дзеяч ТБМ з Наваполацку выставіў у Сеціве аб'яву: хто з жыхароў гораду прачытае яму верш па-беларуску, таго ён пусьціць памыцца ў сваёй ваньне. З гэтага бачна, каго напрымалі ў некаторыя структуры беларускай арганізацыі з славутым мінулым. Жлобскі "сьцёб" здараецца на любую, самую сур'ёзную тэму. Толькі вось хто даў каманду запоўніць гэтай безгустоўнай лухтой інфармацыйную прастору? (Хаця зразумела хто).

"Сьцёб" міжнароднага маштабу назіраецца ў сувязі з "дэсантам" надзьмутых мядзьведзікаў з швэдзкага маторнага самалёту каля Менску. Нават лукашэнкаўскія генэралы загалёкалі: "Держать границу на замке!" А КГБ РБ пачало актыўна лавіць шпіёнаў і нават робіцьператрус у журналіста, які апублікаваў першыя здымкі зь мядзьведзікамі.

І тут высільваецца ў стварэньні піяру згаданая "дэмжурналістыка". Арганізоўваюцца он-лайн канфэрэнцыі з швэдамі, які арганізавалі гэты пацешны "дэсант у падтрымку дэмакратыі". Яго называюць героем і параўноўваюць зь нямецкім дзіваком Рустам, які пасадзіў свой самалёт каля маскоўскага Крамля пры Гарбачове. Уся гэтая псэўдаапазыцыйная фантасмагорыя непрыкметна засьціла сабою тэму неабходнасьці правальваць лукашыстоўскія псэўдавыбары. Звон балалаек вельмі хватка арганізаваны фальсыфікатарамі. Цяпер СМІ ўсяго сьвету будуць паведамляць зь Беларусі пра скінутыя зь неба цацкі, а не пра сапраўдную нацыянальную драму нашага народу.

* * *

Сёлета 10 ліпеня споўнілася роўна 18 год, як А. Лукашэнка быў абвешчаны пераможцам на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 году. Такім чынам, ён дагнаў па гадах цараваньня незабыўнага для старэйшых беларусаў Л. І. Брэжнева, які цараваў у СССР з 1964 па 1982 г. Але да свайго 19-га году пры ўладзе Брэжняў не дажыў. Яго неасьцярожна паставілі на трыбуну маўзалея прымаць парад і дэманстрацыю 7 лістапада. Праз два дні ён памёр. Тады таксама многім здавалася, што Леанід Ільліч – гэта вечна! Пра СССР і КПСС ужо ня кажам – тое было аксіямальна вечна!

За гэтай містыкай многія савецкія людзі не хацелі бачыць эканамічны правал савецкай імпэрыі, старэчы маразм яе існаваньня. Яны несьлі свае потам зробленыя рублі ў брэжняўскія банкі і рабілі праекты на будучыню. А савецкая мафія ціхенька

складвала свае грошы на Захадзе і рыхтавала гэбоўскую “перастройку-гласнасьць”. Потым, калі саўдэпія абвалілася на працягу дзьвюх начэй і двух дзён у жніўні 1991 году, гэтыя многія яшчэ доўга не маглі сьцяміць, што нічога вечнага не бывае. Яны згубілі свае грошы, сваю “родіну-СССР” і яшчэ некаторыя атрыбуты належаньня да “новой обшчности – советского народа”. Менавіта для гэтых людзей прывабнай была савецкая па стылю дэмагогія і хлусьня дзівакаватага калгаснага кандыдата. Яны натоўпамі галасавалі за прайдзісьвета, які дагэтуль дэманструе поўную “адсутнасьць комплексаў”. У 1994 годзе ён на поўным сур’ёзе паабяцаў тым, хто прагаласуе за яго, выдзеліць па лядоўні і каляроваму тэлевізару, а таксама вярнуць страчаныя ў савецкіх банках грошы. Цікава, што многія недзе па 10-12 гадоў чакалі, калі ім пачнуць раздаваць паабяцаныя тавары і купюры. Зразумеўшы ўрэшце, што іх абвялі вакол пальца, яны пачалі гукаць: “Обманул! Обманул!” Няшчасныя людзі, якія даверыліся ворагу чалавецтва, кліенту варожай Масквы.

Але за часы лукашызма сфармавалася яшчэ адна праслойка асобаў, якая ў пэўным сэнсе сталася сымболем нашага палітычнага жыцьця, – падстаўная псэўдаапазыцыя. Менавіта гэтая публіка зарабляе сабе на асабістыя бюджэты даволі вялікія грошы, здаючы, фактычна, усё самае сьвятое: Бацькаўшчыну, праўду, нацыянальныя каштоўнасьці.

З Лукашэнкам большасьці людзей ўсё даволі даўно зразумела. Але вось з гэтым прадуктам лукашызму разабраліся яшчэ ня ўсе. Яны ў чарговы раз заклікаюць беларусаў “пайсьці на выбары, якіх няма”. Кожны на свой капыл, яны абвяргаюць або прафануюць ідэю Народнага Байкоту электаральнага фарсу. Яны рыхтуюць чарговую “элегантную перамогу” хунце калгаснага прайдзісьвета ў той час, калі большасьць людзей на фальшывыя выбары ўжо ня ходзіць.

* * *



Масква зрабіла 26 чэрвеня сваю чарговую антыбеларускую заяву. Агучыў яе сьпікер Дзярждумы РФ С. Нарышкін, які прыехаў у Менск “дамаўляцца пра інтэграцыю”. Ён сказаў, што “канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы Беларусі і Расеі можна будзе прыняць пасьля стварэньня Эўразійскага эканамічнага саюза”. Як заўсёды ў такіх выпадках, маскоўскі чыноўнік рабіў рытуальныя паклоны, прызнаваўся ў любові да Беларусі і навязваўся “в родственнікі”: “Для Расеі адносіны з Беларусьсю маюць прыярытэтны стратэгічны характар. Нашыя краіны і народы маюць агульныя карані, агульную гісторыю...”

Правінцыйная журналістыка РБ адразу пачала вылічаць тэрмін “узьяднаньня з РФ”, абапіраючыся на заяву Нарышкіна. Прыгадалі, што згаданы Эўраазійскі саюз заплянавана ўтварыць роўна да 1 студзеня 2015 г. Маўляў, хваляваццa і бараніць Айчыну яшчэ рана, можна яшчэ гады тры пажыць пры незалежнасьці, а там паглядзім.

Гістарычная практыка, аднак, дэманструе, што верыць такім заявам імпэрскага ворагу могуць толькі дурныя або заангажаваныя людзі. Безумоўна, што Нарышкін паспрабаваў засаніць увагу беларусаў сваёй “далёкай пэрспэктывай”. Так рабілі, напрыклад, Сталін з Молатавым і ўсім Палітбюро ў 1941 годзе. Гукалі на ўвесь сьвет, што зьбіраюцца жыць з немцамі ў міры, у Маскве “па сакрэту” казалі тысячам афіцэраў і чыноўнікаў, што вайну супраць Нямеччыны распачнуць не раней за 1942 год. А тым часам стваралі на мяжы шматмільённыя групоўкі войскаў, каб атакаваць і “вызваляць Эўропу”. Ды толькі гітлерцы разабраліся з крамлёўскай дэзай і ўдарылі раней.

Для беларусаў, што Гітлер, што Сталін – усё адно. Новыя молатавы-дзеканозавы ня здолеюць прымітыўна надурыць наш народ. Трэба салідарна рыхтавацца да абароны Бацькаўшчыны ад маскоўскай агрэсіі.

* * *

Пра “недапушчальнасьць байкоту выбараў” апошнім часам мы наслухаліся ў розных выкананьнях. Вось вытрымкі з “ідэалагемы” вядомага спэцправакатара (ён жа відны дзеяч кампаніі “Говправду”) А. Дзімітрыева, агучанай ім на сайце “Белорусский партизан”:

“Я уверен, для власти безразлично, бойкотирует ли оппозиция выборы или участвует в них. Это мы сами придумали такое разделение, для узкокорпоративных задач... Мне не понятна и не кажется успешной любая тактика “на исключение”. Вместо того, чтобы отговаривать “апатичных” граждан куда-то идти, правильнее было бы потратить все силы и ресурсы, чтобы уговорить их придти. Общество и так пассивно, его нужно активизировать и вовлекать в процесс, чтобы в том числе придти к ситуации, когда сам процесс станет ему интересен. Участие в выборах или любом другом гражданском или политическом процессе – есть основа гражданства и гражданской позиции. Нужно участвовать. Не важно кем: наблюдателем, собрав 10 подписей, или членом участковой комиссии, кандидатом, – но надо придти и посмотреть своими глазами, “что такое политика...” Стратегическая политическая задача – через консолидацию “нового большинства” вокруг единой повестки изменить расстановку сил в обществе и представление их интересов. Для меня не важна и страшна легитимизация Лукашенко, потому как это и так существует. Нам важна легитимизация демократических сил в глазах граждан и легитимизация перемен, которые так нужны стране. Поэтому мы участвуем в выборах, и будем двигаться вперед, шаг за шагом, завоевывая доверие “нового большинства”. План есть, видение тоже. Не хватает людей, очень...” (Канец цытаваньня).

Куръёзная чытанка. “Интересный процесс”, паводле правакатара Дзімітрыева, гэта хадзіць на выбарчыя фарсы дыктатуры – абы “интересно было”. Ён адкрыта прызнаецца, што для яго “легитимизация Лукашенко и так сушчествует”. Але самае галоўнае, што “план” у яго (у Дзімітрыева з “Говправдой”) – “есть”. Яны хочуць стварыць “новое большинство”... А гэта як – “большинство” нашага насельніцтва з гэбоўскіх стукачоў і правакатараў? Атрымліваецца з кантэксту, што так. Ды вось толькі тыпаж прызнаецца, што “очень людей не хватает”.

Як усё ж такі ўскаламуцілася палітычная атмасфэра перад выбарчым фарсам, колькі ўсялякага ўсягo даведаемся мы ад розных каламутаў.

* * *

Нідэрлянды належаць да багатых эўрапейскіх краін, але тым ня менш грошы гэты народ і яго кіраўніцтва лічыць умеюць. Сёлета яны адмовіліся ад правядзеньня ў сябе чэмпіянату Эўропы па гандболу. Польскія аналітыкі наракаюць на вялікія выдаткі ў сувязі з чэмпіянатам Эўропы па футболу на сваіх стадыёнах. Гэта пры тым, што і прыбыткі атрымліваюцца немалыя ў сувязі з прыездам дзесяткаў тысячаў заўзятараў з усяго кантынэнту. Адзін Лукашэнка ды ягоная хунта нічога не баяцца, працягваюць “падрыхтоўку” да чэмпіянату сьвету па гакею, які яны замовілі праводзіць у Беларусі ў 2014 годзе. Адэкватных аб’ектаў на такое мерапрыемства

Заканчэньне на 6-й бачыне

Заканчэньне з 5-й бачыны

яшчэ няма, іх трэба яшчэ будаваць. Грошы раскрадаюцца рэжымнай мафіяй. Чым бліжэй да гэтага непатрэбнага нам чэмпіянату, тым больш грошай рэжым будзе забіраць у мільёнаў нашых людзей, больш заможных і ўжо сто разоў абрабаваных рэжымам. Расея, як вядома “за”, і міжнародная фэдэрацыя па гакею (там камандуюць немцы) таксама “за” правядзеньне гэтага шоў у Беларусі. Можа яны ня ўяўляюць, якое цяжкое становішча ў нашай краіне? Не, усё яны ведаюць і разьлічваюць на тое, што гакейнае шоў урэшце канчаткова падарве эканоміку Беларусі і зробіць Беларусь лёгкай здабычай маскоўскай імпэрыі. Толькі крах рэжыму ўратуе Беларусь.

* * *

У Менску 24 чэрвеня адбылося паседжаньне “Сойму” групоўкі пад кіраўніцтвам А. Янукевіча, якую называюць “псэўда-БНФам”. Пасьля дыскусіі яны заявілі, што іхняя арганізацыя “ідзе на выбары і выстаўляе сваіх кандыдатаў”. Іншага і ня трэба было чакаць ад гэтай публікі.

* * *



У чарговы раз па ўсёй краіне разгарнуўся 3 ліпеня штучны трыюмф лукашызма. Акупацыйны рэжым сьвяткаваў сваю “незавісімость”. Езьдзілі танкі, лёталі самалёты, грымелі аркестры, па вуліцах гналі тысячы статыстаў у розных строях. Даўно заўважана, што ненавісьнікі беларускай незалежнай Дзяржавы і кліенты Масквы здольныя толькі на кіч. Гэтым разам народ ацаніў кічавы спэктакль вельмі адэкватна – байкотам. БТ пазьбягала панарамных здымкаў. Але нават на тэлеэкране бачна было, што на ўзбочынах дарогі, па якой крочыў тысячны кіч, сабралася зусім мала людзей. Гледачамі-удзельнікамі былі толькі тыя, каго туды загналі пад розным повадам (бюракратыя з сем’ямі і прадстаўнікі некаторых залежных сацыяльных катэгорый). Такая карціна назіралася ў сталіцы і па ўсёй краіне.

Янка БАЗЫЛЬ

Акцыя падтрымкі палітвязьняў

Сябры Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы (ЗБМА) 19-20 ліпеня 2012 году правялі акцыю падтрымкі Зьмітра Дашкевіча каля беларускай амбасады ў Вашынгтоне.

У сталіцу ЗША зьехаліся сябры ЗБМА зь Нью-Джэрзі, Нью-Ёрку, Пэнсыльвэніі, Масачусэтсу, Вірджыніі. Мітынгоўцы трымалі плякаты зь віншаваньнямі Зьмітру Дашкевічу, патрабаваньнямі вызваліць яго, Паўла Севярынца і ўсіх іншых палітвязьняў, плякат з напамінам А. Лукашэнку, што ён будзе асуджаны дэмакратычным судом і пакараны за свае злачынствы.

Алена Халадзіліна: “Я была арганізатаркаю дэманстрацыі каля беларускай амбасады. Мяне вельмі ўзрушыў ліст Насты Палажанкі, у якім яна заклікала даносіць інфармацыю пра палітвязьняў да ўсіх заходніх структураў. Таму па даручэньню лідэра нашай арганізацыі Мікалая Цімашэнкі я арганізавала гэтую дэманстрацыю пратэсту. Хочу, каб Зьміцер ведаў, што праца па ягонаму вызваленьню вядзецца, і актывісты нашай арганізацыі заўсёды падымаюць пытаньне аб ягоным лёсе перад амэрыканскімі палітыкамі.”



Яўгенія Стаселовіч (Масачусэтс): “Я разам зь іншымі сябрамі ЗБМА прыехала падтрымаць Зьмітра Дашкевіча з гораду Малдэн каля Бостану. Нам давялося пераадолець каля 9 гадзін дарогі. Я ўзначальваю нашую арганізацыю ў штаце Масачусэтс. Мне хацелася, каб Зьміцер ведаў, што ЗБМА сочыць за ягоным лёсам. Твая мужнасьць, Зміцер, гэта прыклад для нас. Пытаньні пра ціск на Лукашэнку мы падымаем на кожнай сустрэчы з палітыкамі ЗША.”

Зьміцер Хадановіч: “Маёй задачай падчас сёньняшняй акцыі было распаўсюджваньне зваротаў да амбасадараў Эўрапейскага Зьвязу з патрабаваньнем да іх дамагацца вызваленьня Зьмітра. У звароце нашая арганізацыя гаварыла аб тым, што непасьлядоўнасьць Эўропы ў санкцыях да рэжыму Лукашэнкі (візыт старшыні выбаркому Ярмошынай у Вену) вядзе да ўзьнікненьня пачуцьця ўседазволенасьці ў ягоных праслугачоў.

mfront.net

Іслам ля варотаў,

альбо мусульмане ў “краі неабмежаваных магчымасьцяў”

Зусім нядаўна губэрнатар штату Нью-Джэрзі пасварыўся з паліцэйскім дэпартамэнтам Нью-Ёрку. Заканадаўчыя органы паасобных штатаў занятыя разглядам і аналізам абсалютова новай для іх замежнай рэлігійна-юрыдычнай сыстэмы. Агульнапрызнаныя сродкі масавай інфармацыі далікатна абыходзяць рэлігійную прыналежнасьць выкрытых тэрарыстаў, што плянавалі тэракты з максымальнай стратай жыцьцяў амэрыканскага цывільнага насельніцтва. Прэзыдэнт ЗША выбачаецца за спаленьне па недаглядзе колькіх асобнікаў сьвятой кнігі пэўнай рэлігіі на далёкай вайсковай базе. Асьцярожныя пытаньні адносна мэтазгоднасьці перанясеньня традыцыяў і звычаяў пэўнай рэлігіі на амэрыканскую глебу надызваюцца расізмам.

Усё вышэйадзначанае тычыцца рэлігіі ісламу. Прычынаю ўсяго пералічанага ёсьць павелічэньне колькасьці й падвышэньне актыўнасьці ісламскай рэлігійнай меншыні ў ЗША.

Яшчэ нядаўна іслам і брутальныя традыцыі гэтай рэлігіі былі цікавым кур’ёзам, дзівацтвам у далёкіх барбарскіх землях; зьяваю, што належыць, хутчэй, да казак “1001 ночы”, чым да рэаліяў амэрыканскага жыцьця. Сёньня казка робіцца яваю на нашых вачох – і пры нашай маўклівай згодзе. Факты ўваходжаньня нэгатыўных рысаў ісламу і ягонай палітычнай плыні – ісламізму – усяляк скажаюцца, прымяншаюцца і замоўчваюцца агульнапрызнанымі сродкамі масавай інфармацыі (MSM-Mainstram media). Унівэрсытэцкія прафэсары, кіназоркі, актывісты руху “Акупуй Ўол-Стрыт” (АЎС) братаюцца з прадстаўнікамі рэлігійных арганізацыяў, што недвухсэнсоўна заяўляюць аб непрыняцьці Амэрыкі, аб грахоўнасьці заходняй цывілізацыі, крывадушнасьці яе дэмакратыі; якія аб’яўляюць усеагульнае прыняцьце ісламу надзейным рашэньнем ўсіх праблемаў. Гэтае вар’яцкае захапленьне ідэяй абароны ісламу на сёнешні дзень ёсьць найбольш моднаю і стылёваю праяваю прыхільнасьці да псэўдалібэральных каштоўнасьцяў.

Кожны, хто дазваляе сабе мець сумніў у слушнасьці такога стаўленьня да ісламізму ў ЗША, аўтаматычна трапляе ў катэгорыю расістаў, цемрашалаў, “якія нічога не разумеюць пра іслам”, і наагул, у катэгорыю нястыльных асобаў (uncool persons). Кожны нязгодны з экспансіяй ісламізму атрымлівае шыльдачку “ісламафоб”. Гэта, дарэчы, нагадвае практыку шавіністычных расейскіх колаў, якія называюць “русафобіяй” кожную праяву супрацьстаяньня расейскай палітычнай і сацыяльна-культурнай экспансыі.

Паспрабуем коратка разгледзець, ці сапраўды непрыняцьце ісламскай юрыспрудэнцыі-шарыяту, асуджэньне барбарскіх і неталерантных праяваў ісламскага рэлігійнага культу, крытычнае прачытаньне ісламскага сьвятога тэксту Кур’ану і канонаў ісламскай рэлігіі маюць дачыненьне да расізму, цемрашальства, або “ісламафобіі”.

Калі зьвярнуць увагу на сёнешнія плыні ісламу, якія вызнаецца прыкладна адным адсоткам насельніцтва ЗША, кідаецца ў вочы іхная ўнутраная адрознасьць. Мусульмане афраамэрыканцы вызнаюць самаробную сумесь ісламскіх дактрынальных фрагмэнтаў, якую не ўважае за сапраўдны іслам ніводны рэлігійны аўтарытэт зь земляў “гістарычнага” ісламу. Імігранты з ісламскіх краёў ды іхныя нашчадкі належаць да суніцтва, шыізму, бабізму, ісмаілізму ды яшчэ колькіх драбнейшых ісламскіх сэктаў. Іхныя традыцыі й практыкі моцна розьняцца міжсобку.

Расава мусульмане належаць да ўсіх мажлівых расавых групаў, ад мурынаў з Малі й Занзібару да саманавернутых у іслам белых амэрыканцаў (як знаканіты талібанец Джон Ўокер Лінд) ды імігрантаў патурэчаных славянаў з Босьніі й Баўгарыі (басьнякі, памакі). Культурна ды інтэлектуальна сёнешні агульнапрызнаны іслам – вялізны крок назад у параўнаньні да ісламу часоў ягонага росквіту ды мусульманскага адраджэньня на Блізкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі ды мусульманскай Гішпаніі ў сярэднявеччы. Сёньня іслам ня мае ані сучаснага Авіцэны ці Фірдаўсі, ані філязофа кшталту Аль-Фарабі або Ібн Рушда (Авэрроэнса), ані вальнадумца ўзроўню Абу Нуваса ці ваяводы рангу Салядына. (Тут, дарэчы, таксама міжволі напрошваюцца расейскія аналёгіі).



Адным словам, сумленны, неабыякавы грамадзянін Злучаных Штатаў, які падымае законнае пытаньне пра адпаведнасьць амэрыканскай Канстытуцыі дазволу на практыку рэлігійна-юрыдычнай сыстэмы шарыяту, што ставіць “боскае права” вышэй законаў чалавечых, вымагае актыўнага непрыняцьця “іншаверцаў” ды санкцыянуе сэгрэгацыю жанчынаў, калечаньне жаночых органаў і ганаровыя забойствы – ня можа быць ані расістам, ані цемрашалам, ані “ісламафобам”. Наагул, тэрмін “ісламафобія” абсурдны ў сабе, бо пэўная крытыкаваная рыса ісламу можа адкідацца адною плыньню гэтай рэлігіі, і ўхваляцца другой.

Заканчэньне на 8-й бачыне

Іслам ля варотаў

Заканчэньне з 7-й бачыны

Такі пункт гледжаньня не задавальняе псэўдалібэралаў, дзеяньні й рэторыка якіх, асабліва ў шэрагах Дэмакратычнай партыі, у дачыненьні да расава-этнічных, рэлігійных ды гендарных меншыняў нагадваюць ня што іншае як цынічнае празэлітызм, а ў выпадку імігрантаў – імпарт электарату. Чаго вартыя дзеяньні флянса славутай сям'і Кенэды, нябожчыка сэнатара Эдварда Кенэды, які прапанаваным ім законам аб "Уцекачах у Іраку" зрабіў фактам раптоўны прыезд у ЗША 100 тысячаў чалавек з канфліктнай краіны, якіх падбірае не ЗША але ААН, амаль пагалоўна мусульманаў, пэўная колькасьць якіх мае прэтэнзіі да амэрыканскай акупацыі, і ня менш пэўная колькасьць з каторых не зможа ў сілу розных прычынаў інтэграваца ў амэрыканскае грамадзтва. Што будзе далей? Новыя хатнія тэрарысты і гэтам часам удалыя тэракты на Таймс-скўэр, у Нью-Ёрскім сабўэі, каля іншых сымболяў амэрыканскага ладу жыцьця й дэмакратыі?

Аўтар ня хоча тут гістэрыкі, бажавольства й дэпартацыі мусульманаў. Але законныя пытаньні грамадзянаў мусяць быць прынятыя з належнаю павагаю і развагаю, як масавымі сродкамі, гэтак і аналітыкамі, акадэмікамі, палітыкамі, працаўнікамі шоў-бізнэсу і гэтак далей. Бо сёньня Амэрыка ўцягнутая ў велізарны экспэрымэнт, вынікі якога няпэўныя і непрадказальныя. У цяперашнім "пост-мадэрным" грамадзкім клімаце практыкаваньня ўседазволенасьці й прыніжаных стандартаў для прадстаўнікоў неэўрапейскіх нацыянальных групаў сплочаная, салідарная рэлігійная меншыня, увасобленая ў супрэматысцкім ісламісцкім руху, можа адыграць ролю бальшавікоў або вэстготаў ці вандалаў, што, барані Божа, заваляць амэрыканскую рэспубліку. Пакуль невялікія ісламісцкія арганізацыі літаральна за некалькі гадоў дасягнулі вынікаў, якія па адноснаму маштабу ды ўплывовасьці даюць фору такім старым рэлігійна-этнічным супольнасьцям ЗША, як ірляндзкая, гэбрайская або італьянская.

Ісламісты ўваходзяць у цяперашнія заходнія грамадзтвы як нож у масла, не сустракаючы амаль ніякіх станоўкіх перашкодаў. У Эўропе й Расеі гэта бачна асабліва яскрава. Там утварыліся зоны, недаступныя для паліцыі й дагляду законаў, падвышаецца патураньне рэлігійным і звычаёвым практыкам, што супярэчаць эўрапейскаму заканадаўству. А супраціў такім практыкам голасна дэкляруецца як "расізм" і "ксэнафобія". Агульнапрызнаныя мэдыі карыстаюць з табу на агалошваньне рэлігіі злачынцы пры паведамленьнях аб крымінальных выпадках, замятаюць пад палавік статыстыку парушэньняў між мусульманаў, замоўчваюць факты ісламскіх "ганаровых злачынстваў" або кваліфікуюць іх як "хатні гвалт". Акадэмікі апраўдваюць як "традыцыю" сэгрэгацыю жанчынаў, палігамію, рэлігійны экстрымізм ды кожны іншы несумяшчальны з сучаснай цывілізацыяй ісламскі звычай.

Не адстаюць у гэтым і амэрыканскія мэдыі. Чаго вартае замоўчаньне такіх жудасных выпадкаў, як напрыклад, сэкс-гандаль сярод самалійскіх імігрантаў у Мінэсоце, практыкаваньне шарыяту ў Дыяборне (штат Мічыган) або зьверскае забойства кіраўніком ісламскага тэлеканалу ў Бафала (штат Нью-Ёрк) сваёй жонкі, маўчаньне пра факты ганаровых забойстваў бацькамі "за распусту" дзяўчатаў, што сталі сустракацца з бойфрэндамі-немусульманамі. Напэўна, каб падобнае адбывалася сярод хрысьціянаў ці мармонаў, падзеі да драбніцаў тыднямі абсмокталіся б у "Нью Ёрк Таймс" і на Сі-Эн-Эн. Што горш, усяляк абыходзяцца ўвагаю радыкалізацыя прадстаўнікоў ісламскай меншыні ў ЗША, павелічэньне колькасьці прадухіленых тэрактаў, рыхтаваных мусульманамі Амэрыкі, у большасьці амэрыканскімі грамадзянамі. Гэта тым болей цяжка зразумець, калі ўзяць пад увагу, што краіна знаходзіцца ў стане вайны з ісламскім тэрарызмам і мае войскі, якія непасрэдна змагаюцца супраць яго ў Аўганістане, а таксама мае сотні тысяч вэтэранаў, якія рызыкавалі ў тым жа Аўгане ды Іраку жыцьцямі дзеля таго, каб журналісты, артысты, комікі, аналітыкі ды акадэмікі Амэрыкі чуліся бясьпечна і камфортна.

Амэрыка ёсьць, як вядома, краем неабмежаваных магчымасьцяў. Гэтыя магчымасьці, дарэчы, скарыстала на поўніцу сталінскае НКВД ў 1940-я і 1950-я гады, здабыўшы Саветам шмат чаго, ад атамнай бомбы і да дажыўшай дасюль прыхільнасьці левай грамадзкай думкі. Шкада, што гэтыя магчымасьці зрабіліся сапраўды неабмежаванымі і неаспрэчанымі для падступных рухаў кшталту ісламізму.

Віталь ЗАЙКА

Іслам – ёсьць іслам

Упершыню сур'ёзна задумацца над тым, што ж тое іслам, мяне, напэўна, прымусілі жахлівыя тэрарыстычныя акты 11-га верасьня 2001 году. Да гэтага я, мяркую, як і большыня людзей, хто ніколі блізка з вучэньнем Магамэта не сутыкаліся, лічыў іслам звычайнай рэлігіяй, ня горшай і ня лепшай за іншыя. Але стараючыся зразумець, што ж піхнула маладых арабаў на самазабойчыя акты, якія сталіся прычынаю гібелі тысячаў нявінных людзей, аналізуючы інфармацыю на гэтую тэму, я прыходжу да высновы, што іслам шмат чым адрозьніваецца ад іншых рэлігіяў.

Сёньня, як ніколі раней, насьцярожваюць высновы многіх амэрыканскіх і міжнарожных экспэртаў, што іслам – гэта ня проста рэлігія. Гэтае вучэньне радыкалізавана ў геапалітычную вайсковую сыстэму, што пачала наступ супраць Амэрыкі і Захаду. Але яшчэ больш насьцярожвае ўпартае нажаданьне заходняга грамадзтва, прынамсі, лібэральнай ягонай часткі, не заўважаць гэтую радыкалізацыю. Яно надае ісламу свой уласны прагрэсіўны імідж шляхетнай, фундамэнтальна талерантнай "рэлігі міру". Прагрэсіўныя мысьляры імкнуцца не заўважаць тыя хібы ісламу, якія ня ўпісваюцца ў гэты імідж. Яны ўпарта даказваюць, што тыя мусульмане, хто строга выконвае патрабаваньні Кур'ану ў часцтцы ўвядзеньня дыктату шырыяту – мусульманскай легальнай і палітычнай сыстэмы – уцягнутыя ў "антыісламскую дзейнасьць". Калі ўзрастаючая кампанія ісламізацыі ўжывае сілу, што часта здараецца, яны абсурдна настойваюць на тым, што гэта было выклікана не ідэалёгіяй ісламу, а амэрыканскай палітыкай ці нейкім дзеяньнем Ізраіля па абароне сваёй краіны. Як быццам такое тлумачэньне можа абгрунтаваць забойчы джыхад мусульманаў Нігерыіі супраць хрысьціянаў гэтай краіны ці эгіпэцкіх мусульманаў супраць хрысьціянаў-коптаў, ці, напрыклад, няспынныя ўзаемныя забойствы сунітаў і шыітаў у Іраку – традыцыі амаль такой жа старой як сам іслам.

Мусульмане Блізкага Ўсходу сёньня добра засвоілі той імідж ісламу, які

прыдумалі для іх на Захадзе, і пасьпяхова ім карыстаюцца для дасягненьня сваёй мэты. А мэта гэтая ня што іншае, як поўная дамінацыя ісламу ў сьвеце.

Заходнія лібэралы ніяк ня хочуць прызнаць рацыю Самуэля Гантынгтона, які даўно вызначыў, што праблема Захаду не ў ісламскім фундамэнталізме, а ў тым, што “іслам – іншая цывілізацыя, прадстаўнікі якой пераканаными ў перавазе сваёй культуры”. Мусульманскіх лідэраў прыводзіць у захопленьне божае наканаваньне пашырэньня іхняй рэлігіі. Гэты празэлітызм не абмяжоўваецца духоўнымі прынцыпамі, а ўлучае ў сябе цэлы грамадзкі лад, які мае свае законы на кожны бок штодзённага жыцьця, пачынаючы аднасінамі ў грамадзтве, фінансамі і канчаючы пэрсанальнай гігіенай.

Заходняму грамадзтву найперш трэба зразумець, што ў мусульманскім сьвеце галеча, неадукаванасьць, недахоп дэмакратычных інстытутаў, таксама як антысэмітызм, антыамэрыканізм, схільнасьць верыць у змову няверных супраць іх ёсьць вынікам гегемоніі і супрэматысцкіх тэндэнцыяў ісламу, а не ягонаю прычынаю.

Другім важным момантам ёсьць разуменьне таго, што іслам утварае ўнікальную цывілізацыю. Гэта ня проста адзін з каляровых каменчыкаў у прыгожай мазаіцы мультыкультуралізму, а цалкам адрозны погляд на сьвет.

Добрай ілюстрацыяй нашых адрозьненьняў тут можа быць прыклад “арабскай вясны”. Лібэраламі навязаная думка, што масавыя народныя паўстаньні абавязкова ёсьць дэманстрацыяй імкненьня да свабоды, якая, як сказаў у 2004 годзе прэзыдэнт Джордж Буш, “жыве ў кожным чалавечым сэрцы”. Як і яе наступнікі, адміністрацыя Буша замест дасканалага і аб’ектыўнага вывучэньня ісламу ўкараняла думку, што заходняе грамадзтва нешта зрабіла ня так, калі заслужыла такую нянавісьць мусульманаў. І што ёсьць шляхі выправіць свой імідж у іхных вачах. І ў гэтым шыракараспаўсюджаным самаабвінавачаньні далёка ня кожны з нас ведае, што на арабскую слова “свабода” перакладаецца “хурыя”, што, акрамя звыклага разуменьня гэтага слова, таксама значыць абсалютнае падпарадкаваньне Алагу. Як бачым, значэньне амаль супрацьлеглае заходняму разуменьню гэтага слова. І нават калі мы пагодзімся, што ўсе людзі імкнуцца да свабоды, то нам ніколі не знайсьці агульнай мовы з мусульманамі ў тым, што ж гэтая свабода значыць.

Найбольшаю віною арабскіх дыктатараў у вачах сучасных мусульманаў была не адабраная асабістая свабода, а перасьлед імсламу. Безумоўна, іх абурала, што іхныя арафаты, мубаракі, каддафі ды саддамы рабавалі свае краіны ў той час, калі большасьць насельніцтва жыла ў галечы. Але галоўнаю прычынаю, што штурхнула народныя масы на супраціў, было тое, што злачынствы дыктатарскіх рэжымаў былі ім патлумачаныя як грахі супраць законаў Алагу. Самай уплывовай інстытуцыяй, што так тлумачыць падзеі ў ісламскіх грамадзтвах, ёсьць “Браты-мусульмане”. Яны ўжо цягам амаль 90 гадоў сьцьвярджаюць, што “Кур’ан – наш закон, і джыхад – наш шлях”. Прыхільнікі гэтага руху – самая шматлікая, найбольш актыўная і дысцыплінаваная частка грамадзтва мусульманскіх краінаў.

Цяпер становіцца зразумелым, што заходняя канцэпцыя быццам канец тыраніі абавязкова прывядзе да нараджэньня свабоды, заўсёды была памылковаю. Тая частка насельніцтва мусульманскіх краінаў, што імкнецца да свабоды ў заходнім разуменьні гэтага слова, складае ня больш за 20%. “Арабская вясна” была вызваленьнем ісламу з-пад кантролю тыранаў, а не ўздым барацьбы за дэмакратыю.


Прэм’ер-міністар Турцыі Рэджэп Эрдаган, які абраны на пасаду ўжо трэйці раз, увогуле адмаўляе ісаваньне ўмеркаванага ісламу. “Іслам – ёсьць іслам”, – сказаў ён. Добра вядома яшчэ адно ягонае выказваньне, што “дэмакратыя – гэта цягнік, зь якога можна саскочыць, калі даехаў да мэты падарожжа”. Мэта ісламскіх супрэматыстаў – усталяваньне шарыяту, фундамэнту любога ісламскага грамадзтва. А працягласьць падарожжа на цягніку дэмакратыі залежыць ад абставінаў.

Ісламскія партыі пад кіраўніцтвам “Братоў-мусульманаў” сталі сапраўднымі экспэртамі, рэпрэзэнтуючы сябе як умераных і кажучы Захаду тое, што ён хоча пачуць, у той самы час аплятаючы, на колькі дазваляюць умовы, свае краіны павуціньнем шарыяту. Яны ведаюць, што калі Захад кажа “дэмакратыя”, то мае на ўвазе свабодныя выбары, а не заходнюю культуру дэмакратыі. Яны ведаюць, што Захад так праслаўляе гэтыя выбары, што пераможцы могуць скрасьці іх, адмовіцца аддаваць уладу, калі пазьней прайграюць, ці адмяніць наступныя выбары без пагрозы страціць пасьля гэтага сваю легтымнасьць. Яны ведаюць, што паўтарэньне мантры “дэмакратыі” робіць ісламістаў героямі ў вачах Захаду. І яны ведаюць, што адміністрацыя Абамы і Эўрапейскі Зьвяз увялі сябе ў зман, што ісламісты стануць памяркоўнейшымі як толькі адчуюць на сабе адказнасьць кіраваньня дзяржавай. Насуперак гэтым ілюзіям, як толькі ісламісты прыходзяць да ўлады, яны робяць атрутны антыамэрыканізм сваёй афіцыйнай палітыкай і ахвяруюць сродкі на панісламскую мэту зьнішчэньня Ізраілю.

Гаворачы пра падарожжа на цягніку дэмакратыі, трэба мець на ўвазе і тых мусульманаў, што мільёнамі едуць у Эўропу і Амэрыку. Для іх гэтае падарожжа яшчэ працягваецца. Але няма сумніву, што, як толькі яны адчуюць сваю моц і змогуць дыктаваць свае законы, г.зн. даедуць да свайго прыпынку, то гульні ў дэмакратыю для іх скончацца. Жыцьцё дае пацьверджаньні гэтаму кожны дзень. Іслам – ёсьць іслам.

Нам ня трэба мець ілюзіяў на гэты конт і неабходна рабіць адпаведныя высновы цяпер.

Марат КЛАКОЦКІ



Купальле ў Нью-Ёрку

Заканчэньне з бачыны 1

Так, нашыя продкі былі язычнікамі. Яны ўслаўлялі прыроду, створаную Богам, адчувалі сябе дзецьмі прыроды і таму шанавалі яе, услаўляючы ў песьнях і танцах.

Агонь, які б ён ня быў, сонечны, ад сьвечкі ці ад вогнішча, нясе ў сабе ачышчальную сілу і змагаецца зь цемраю. Вада таксама валодае раствараючай здольнасьцю і ачышчальнаю сілаю. У Купальскіх паданьнях жыцьцядайны агонь вялікага бога Грымотніка, ён жа Пярун і Ярун, ажыўляе мёртвыя воды вялікай багіні Мары, яна ж Мар'я, Марыя. Пярун перасьледуе свайго зьверападобнага ворага Вялеса – цмока, які хаваецца пад дрэвам, каменем, пераўтвараецца ў розных жывёлаў. Пад час двубою Пярун валіць дрэвы, расколвае камяні, кідае стрэлы. Пярун – вершнік на вогненным кані ці калясьніцы, выява якой у выглядзе шасьціканцавога крыжа на ягоным шчыце. Жытло Пяруна – узвышша, высокая каменная гара. У паданьнях і песьнях на гары ўзгадваецца дуб. Зброя Пяруна – сякера і молат, камяні, кап'ё, меч, што б'е маланкай, лук і стрэлы.

Як пісалі яшчэ ў XV ст.: ”Пярун ёсьць многъ”, таму Ярыла разглядаўся адною зь ягоных іпастасяў ці ягоным сынам. Менавіта Ярыла стаў правобразам вершніка беларускалітоўскага герба Пагоня. Хрысьціянскі расейскі “Георгий победоносец”, які забівае цмока, таксама ад яго.

Дык вось на Купальлі, якое мы спраўляем па сонцу, калі дзень самы доўгі, а ноч – самая кароткая, мы ўслаўляем тое, што стварыў Бог, а менавіта – сонца, ваду, росквіт прыроды, каханьне, у рэшце, само жыцьцё. Веруючыя людзі штодня моляцца Богу, і я ня бачу граху ў тым, каб раз на год сваімі песьнямі і танцамі мы з удзячнасьцю ўславілі тое, што Ён стварыў. А калі гэта грэх, то тады трэба адрачыся і ад нашага герба Пагоня, як і ад Георгія пабеданосца, што праціеае сваім кап'ём зьмея, бо вытокі іхныя ідуць ажно з часоў язычкіх, якія хрысціяне назвалі паганскімі?

Вось таму сёлета, як і штогод, мы зладзілі нашае Купальле, якое, на вялікі жаль, ужо сьтраціла сваю абраднасьць і захавалася толькі ў выглядзе песень, карагодаў і гульняў, ачышчаючых скокаў праз вогнішча ды плаваньне ў возеры. Сабралася нас каля васьмідзесяці чалавек. Шкада, што ня ўсе патрапілі на агульны здымак, бо некаторыя крыху запазьніліся. Купальшчыкі прыехалі ня толькі зь Нью-Ёрку, а і з Пэнсыльвэніі, Масачусэтсу і нават са штату Вэрмонт. Як ніколі дагэталь, было шмат дзетак. Надвор'е спрыяла. Не было дажджу. Было ня горача, ня холадна, а як раз так, як трэба.

Усе дружна апрануліся ў строі. Ледзь сонца села, абралі Купалінкаю прыгажуню Натальлю, а Князем-Купалішам – закаханага ў яе высокага хударлявага Міхася Буслава, уручылі яму княжы вянок з дубовых лісьцяў і паходню. Падпаліўшы яе, разам з Купалінкаю ўдвох яны распалілі купальскае вогнішча. І даволі такі вялікі карагод нясьпешна рушыў па ходу сонца зь песьняю: “А ў нас сёньня – Купалачка, а ў нас заўтра – Іванічка”. Потым прагучэла: ”Хадзіў чыжык па вуліцы, клікаў дзевак на Купальле”. Было прыемна, што ўсе старанна і зычна сьпявалі за мною сьледам, бо я, як заўжды, была запявалаю. Лялька Мара, якая гэтым разам была сымболем зла, атрымалася вельмі прыгожаю. Але, ня гледзячы на гэта, яе ўрачыста спалілі пад карагод: “Ня дзеўка агонь клала, сам Бог агонь раскладаў, усіх сьвятых да сябе зваў.”



Здымак А. Тура.



Здымак А. Тура.

Пакуль гулялі ў розныя гульні, нехта пастараўся скрасьці Купалінку. Але Купаліш з годнасьцю вярнуў яе да вогнішча і купальшчыкаў. Вялікаю папулярнасьцю карысталася гульня ў Цяцерку, калі пад песьню: ”Я цяцерку пасу – вух я! На зялёным лугу – вух я! Я цяцерку за хвост – вух я! А цяцерка пад мост – вух я!” Хлопец, ідучы звонку, праводзіў дзяўчыну між калёнамі хлопцоў і дзяўчат, а ў канцы калёны яна вырывалася і ўцякала, а задача хлапца была злавіць сваю цяцерку, каб ва ўзнагароду атрымаць пацалунак.

Усе былі такія маладыя, прыгожыя і добрыя, а беларускія строі яшчэ больш падкрэсьлівалі іхную годнасьць. Сяржук



Здымак С. Трыгубовіча.

Сокалаў-Воюш, як заўсёды ўнёс дух патрыятызму сваімі бардаўскімі песьнямі. Як ніколі раней вельмі шмат скакалі праз вогнішча. Пятро Рыжы згатаваў крупнік з гарэліцаю на мёдзе, які прыдаў імпэту і аднавіў галасы.

Калі срэбны маладзічок некуды зьнік, а неба асьвятлялі адныя зіхаткія зоркі ды нашае вогнішча, мы пайшлі на возера. Купальнікі ў нас былі аўтэнтычныя, г. зн. не было ніякіх. У цемры праглядаліся толькі цені ды чуўся перакацісты сьмех. Здавалася, што сярод возера расьце чарот, ажно гэта па вадзе плыў такі густы туманок. Вада была цёплая і мяккая, амаль як ў Беларусі. Плавалі мо з гадзіну. З вады не хацелася выходзіць.

Калі вярнуліся на купальскі пагорак, вогнішча ўжо паціху дагарала. Купальшчыкі сядзелі наўкола і сьпявалі. Раптам Марыя Флярыяновіч, што прыехала на Купальле з дачкою Ганнаю са штату Вэрмонт, што ў пяці гадзінах язды, захацела прачытаць верш Уладзімера Караткевіча “Беларуская песьня”.

Дзе наш край?
Там, дзе людзі ніколі ня будуць рабамі,
Што за поліўку носяць ярмо
Ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны як скалы –
Ударыш і зломіцца меч...

Верш прагучаў як набат. І гэтак добра быў прачытаны, што раздаліся захапляльныя воклічы:”Брава!”

Зноў песьні, а потым абаяльная дзяўчына Тацьцяна Масюк прачытала байку К. Крапівы “Дзіця, зьмяя і вожык”.

Сонца паціху пачало пакрываць пазалотаю верхавіны дрэў і кустоў. А нашыя песьні, хоць цяпер гучэлі ўжо ня так моцна, але не заціхалі. Алесь Тур ужо сьпяшаўся зь сябрамі на працу, некаторыя пасунуліся ў свае намёты, а Віця Дудараў прыдрамнуў проста ля агню. Але шмат хто й ня думаў пра сон. Тым часам пасьпела запечаная ў вуглях бульбачка. Пятро Рыжы ўсіх жадаючых частаваў гарачаю каваю. Лес абуджаўся пад залівістыя сьпевы птушак. Ён сапраўды, бы боскі храм, ачышчаў нашыя душы і сэрцы. Міжволі ўзгадаўся верш Анатоля Сыса:

Бо Лес – гэта больш, чым лес.
Вам ранілі гострым сэрца,
крывавіць, баліць парэз,
і хочацца толькі сьмерці,
стрывайце, знайдзіце моц
дайсьці, дапаўзьці да Лесу,
ён з боскай крыві прарос
пакутнікам правіць месу,
ён спыніць жывіцай кроў –
такога ня змогуць людзі,
і, быццам прадвесьні гром,
у Вас н е м а ў л я прабудзіць...

Алесік Рыжы, прачнуўшыся, паскакаў праз ужо амаль патухшае вогнтшча, потым выцягнуў апошнюю тлеючую галавешку і старанна прысыпаў яе пясочкам. Сонца пачало прыпякаць. Моладзь па другому разу накіроўваўся на возера. Сёй-той вырашыў пабаляваць на прыродзе да вечара. А мы мусілі ўжо вяртацца дахаты. Купальле ўдалося на славу. Здаецца будуць новыя шлюбы. Прынамсі, спадзяемся.

Шчыра шкада тых, хто адмаўляе сабе ў нашым Купальлі, не разумеючы, што стане пасьля яго чысьцейшым душою і моцнейшым беларусам.

Валянціна ЯКІМОВІЧ

Шаноўныя падпісчыкі “Вестак і Паведамленьняў”!

Інфармацыю аб стане Вашай падпіскі на бюлетэнь Вы заўсёды можаце знайсьці на адраснай налепцы, што будзе прыклееная на канвэрт, у якім прыйдзе па пошце чарговы нумар “Вестак і Паведамленьняў”.

Нагадваем, што гадавая падпіска на наш інфармацыйны бюлетэнь каштуе **$30**.

Ніжэй падаём прыклад адраснай налепкі з інфармацыяй (справа ад імя) аб падпісцы. На налепцы відаць, што апошняе ахвяраваньне ў памеры 30 дал. было зробленае ў ліпені 2012 году. Гэта значыць, падпіску трэба абнавіць да канца ліпеня 2013 г.

Mr. Janka Javar **30-7/12**
123 Avenue A, apt. 5
Brooklyn, NY 11234

Калі ласка, сваечасова працягвайце падпіску і паведамляйце пра зьмену паштовага адрасу.

Марш Паняволеных Народаў

Заканчэньне з бачыны 1

амэрыканскіх арганізацыяў палякаў, мадзяраў, чэхаў, сэрбаў, украінцаў, славакаў, летувісаў, румынаў, татараў, казакоў – прадстаўнікоў усіх краінаў Усходняй Эўропы і Азіі, якія падмяў пад сябе маскоўскі бальшавізм. Адным з адмысловых мерапрыемстваў Тыдня была дэманстрацыя Паняволеных Народаў ля Статуі Свабоды на 200-годзьдзе ЗША. У 1988 годзе, на 30-годзьдзе Тыдня, у ягоных падзеях узяў удзел прэзыдэнт ЗША Рональд Рэйган, які ў сваёй прамове сказаў: “Амэрыка ніколі не забудзецца на пакуты паняволеных народаў па ўсім сьвеце, і мы ніколі не перастанем казаць праўду. Вашае змаганьне ёсьць і нашым змаганьнем. Вашая мара – і нашай марай. І аднойчы вы станеце вольнымі.”

Актыўны ўдзел у падзеях Тыдня заўсёды бралі беларускія арганізацыі, асабліва Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне. Сёлета нікога ад Задзіночаньня не было, затое скрозь луналі бел-чырвона-белыя сьцягі сябраў Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, якое першы раз афіцыйна ўзяло ўдзел у Тыдні, што пачаўся Маршам Паняволеных Народаў. Удзельнікі імрэзы сабраліся каля гатэлю “Пляза” на 59-й вуліцы і 5-й авэню. Затым яны калёнай пайшлі да сабору сьв. Патрыка на 50-й вуліцы, дзе адбылося асьвячэньне сьцягоў ды імша за Паняволеныя Народы й вызваленьне іх ад тыраніі. Па імшы ўдзельнікі прайшлі маршам па 5-й авэню да 72-й вуліцы. Падчас Маршу гучэлі лёзунгі “Жыве Беларусь!”, “Лукашэнка мусіць сыйсьці”, “Беларусь – ТАК! Лукашэнка – НЕ!” Скрозь дамінавалі нацыянальныя беларускія бел-чырвона-белыя сьцягі, маршыруючыя несьлі плякаты “Свабоду палітвязьням”, “Далоў Лукашэнку”, “Жыве Беларусь”.



Здымак Н. Патапенка

У Цэнтральным парку адбылося афіцыйнае адкрыцьцё Тыдня Паняволеных Народаў, якое адкрыў уступным словам сп. Горст Уліх, старшыня Камітэту Паняволеных Народаў. Былі зачытаныя праклямацыі ад мэра Нью-Ёрку і губэрнатара штату Нью-Ёрк. Ад беларускай грамады выступіў сябар управы Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня” Віктар Едзіновіч, які прысьвяціў галоўную ўвагу выступу ўдзелу моладзі ў змаганьні за свабоду й дэмакратыю ў Беларусі.

Выступілі таксама прадстаўнікі Камітэту ад Эстоніі, Усходняй Прусіі, Нікарагуа. Была прынятая рэзалюцыя, у якой урад ЗША заклікаецца да больш актыўнага ўдзелу ў дапамозе Паняволеным Народам і асуджаецца тыранія посткамуніўму ў сьвеце, і, у прыватнасьці, у Беларусі, дзе рэжым Лукашэнкі застаецца рэліктам несвабоды й рэпрэсіяў на эўрапейскім кантынэнце. Прамовы былі ўважліва выслуханыя прысутнымі, большасьць якіх складалі прадстаўнікі “Пагоні” ды іхныя сябры і знаёмыя.

Віталь ЗАЙКА

Уплаты ў Згуртаваньне “ПАГОНЯ”

Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

В. Аднавораў 50
Н. Бабко 50
А. Бахчэеў 50
Н. Лазоўская 50
А. Малчанаў 50
А. Таболіна 50

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя скарбніцы
Valentina Balashchenko.

---

*Паважаныя **Марыя Волкава, Тацяна Каляда, Ксенія Кузьменка, Алена Саковіч** калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”

адбудзецца **11 жніўня 2012 г.** у парку **Фляшынг Мэдаўз-Карона Парк** (**Flushing Meadows Corona Park**) у Кўіньсе. Сход мяркуецца правесьці ў нязмушанай абставінах для лепшага калегаваньня паміж сябрамі. Прыносьце з сабою штосьці зь ежы й пітва, бярыце мячы, фотакамэры ды што яшчэ звычайнае для адпачынку.

Пачатак сходу а 10:30 раніцы.

Даезд падземкай:

*Цягнік лініі **R** у Кўінс да прыпынку **63 Drive**, тады выйсьці на паўночную частку **Queens Blvd** ды пайсьці па **63 Drive** 7 блёкаў да канца, потым ўзяць улева 3 блёкі да **62 Drive**, прайсьці праз дзіцячую пляцоўку на мост праз **Grand Central Pkwy**, і тады за мастом будзе месца збору, пазначанае бел-чырвона-белым сьцягам.*

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

Н. Бабко 30
А. Бахчэеў 30
В. Кавалёва 30
Н. Лазоўская 30
А. Малчанаў 30
А. Пранцэвіч 30
А. Таболіна 30
А. Фішчук 30

Шчыры дзякуй!

---

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **“Весткі”** выпісвайце на імя **Valentina Balashchenko***

*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы сайт **www.e-krama.com***

Емэйл адрас рэдакцыі бюлетэня:
viestki@mail.com